

Т.**Яршова** ў ролі Нэле.

фа), Дзева-выбранніца («Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага), Джульета («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева) і інш. Лаўрэат Міжнар. конкурсаў артыстаў балета ў Варне (Балгарыя, 1974), Маскве (1977).

*Літ*.: Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988. С. 105—107, 109—112, 116—117; Мушынская Т. Гаркавы смак ісціны: Партрэты. Мн., 1993. С. 65—71.

Т.**Яршова** ў ролі Аўроры.



**Я́СЕЛКА**, назва бел. тэатра батлейкавага тыпу, самая даўняя і кансерватыўная яго форма. Таксама назва скрынкі з нерухомымі лялькамі — правобраз і папярэдніца батлейкавага тэатра (гл. *Батлейка*). Назву атрымала ад ясляў (прыстасаванне для корму жывёлы ў хляве), дзе, паводле біблейскага падання, нарадзіўся Ісус Хрыстос. Былі вядомы пераважна ў зах. частцы Беларусі. Уяўляла адкрытую скрынку накшталт аднапавярховага доміка без пярэдняй сцяны з лялькамі, якая выстаўлялася ў час богаслужэння на Каляды ў храмах. Пры дапамозе лялек ствbooралася панарамная статычная кампазіцыя — сцэны на адну з біблейскіх тэм (нараджэнне Хрыста, пакланенне вешчуноў і г.д.). Паказы суправаджаліся звычайна спяваннем рэліг. вершаў, кантаў і псальмаў. Часам Я. аздаблялі дэкаратыўнымі дэталямі, промнямі каляднай зоркі з каляровых паперы і кардону, якія ўваходзілі ў атрыбутыку нар. калядных тэатралізаваных прадстаўленняў.

*Літ*.: Барышаў Г.І., Саннікаў А.К. Беларускі народны тэатр «батлейка». Мн., 1962; Каладзінскі М.А. Батлейка // Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1; Народны тэатр. Мн., 1983; Барышев Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII века. Мн., 1992; Lewański J. Związki literackie polsko-ruskie w dziedzinie dramatu wieku XVII—XVIII // Z polskich studiów slawistycznych. Warszawa, 1958. T. 2.

*М.А.Каладзінскі, І.А.Алексніна.*

**«Я́СНАЕ СВІТА́ННЕ»**, героіка-рэвалюцыйная опера ў 3 дзеях, 7 карцінах А.*Туранкова*. Напісана ў 1958. Лібрэта А.Бачылы. У аснове зместу падзеі 1939, якія адлюстроўваюць уз'яднанне Зах. Беларусі з БССР. На сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі прэм'еры оперы адбыліся 2.11.1958 (дырыжор Л.Любімаў, рэж. Л.Александроўская, мастак П.Масленікаў, хормайстар М.Прысёлкаў, балетмайстар К.Мулер; Мікола — Б.Нікольскі, Марына — Л.Галушкіна, Лагоўскі — У.Глазаў, Сцяпан — А.Генералаў, Юзэфа — Н.Дзвінянінава, пан Гадлеўскі — Л.Бражнік, пан Вронэк — В.Глушакоў) і 12.1.1964 (рэдакцыя Г.Вагнера; дырыжор Л.Любімаў, рэж. Дз.Смоліч, мастак Я.Чамадураў, хормайстар А.Кагадзееў, балетмайстар А.Андрэеў; Мікола — В.Гур'еў, Марына — Галушкіна, Лагоўскі — А.Саўчанка, Сцяпан — І.Сарокін, Юзэфа — Н.Ткачэнка, пан Гадлеўскі — В.Чарнабаеў, пан Вронэк — В.Кірычэнка). Недахопы драматургічнага і муз. планаў не дазволілі оперы замацавацца ў рэпертуары тэатра.

*Г.Р.Куляшова.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ